праекты

# «Вопыт прысутнасці»

**Фотавыстаўка пад такою назваю, прымеркаваная да 30-годдзя творчай дзейнасці Марыны Бацюковай, адкрылася ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**

Марына Бацюкова — удзельніца і куратар шматлікіх выставак і праектаў у Беларусі і за мяжой, член Беларускага саюза мастакоў, Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў.

У прадстаўленай экспазіцыі — серыя здымкаў, зробленых падчас падарожжаў па Германіі, Ізраілі, Азербайджане, Грузіі, Францыі і Арменіі ў 2014—2015 гадах. Гэта візуальны дзённік уражанняў ад асабістага знаёмства з краінамі, мастацкія вынаходкі і ўнікальныя вобразы.

Армянскія музычныя матывы, рытмы Мюнхена і Берліна, іншапланетны горад Мцхета, чароўны Уплісцыхе, тэатр марыянетак Рэзо Габрыядзэ, шум Парыжа, каларытны Баку — усё гэта стварае ўнікальную аўтарскую прастору ўражанняў, прастору паміж рэальнасцю і асобай, паміж марай і вопытам прысутнасці.

Нацыянальны і культурны каларыт краін прадстаўлены манахромнымі здымкамі-гісторыямі, вельмі рэальнымі, дасканалымі, знятымі на плёнку і надрукаванымі ўручную ў класічнай тэхналогіі бром-срэбных адбіткаў, чыстымі малюнкамі оптыкі.

Фота дэманструюцца ў Беларусі ўпершыню.

**Міра ІЎКОВІЧ**